| МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ | МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ |
|---|---|
| **ПАСТАНОВА** | **ПОСТАНОВЛЕНИЕ** |
| 13.02.2025 № 9 | |
| г. Мінск | г. Минск |

Аб змяненні катэгорый гісторыка-культурных каштоўнасцей

На падставе пунктаў 2, 6 артыкула 96 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, абзацаў другога і трэцяга падпункта 5.13 і падпункта 5.14 пункта 5 Палажэння аб Міністэрстве культуры, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 студзеня 2017 г. № 40, рашэння Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь ад 10 лютага 2025 г. № 04-01-02/1, Міністэрства культуры ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Змяніць катэгорыю гісторыка-культурных каштоўнасцей:

“Будынак Нацыянальнага драматычнага тэатра імя М.Горкага” па вул. Валадарскага, 5 (два будынкі) у г. Мінску з катэгорыі “3” на катэгорыю “2”;

“Будынак Беларускай дзяржаўнай філармоніі” па пр. Незалежнасці, 50 у г. Мінску з катэгорыі “3” на катэгорыю “2”.

2. У падраздзеле “г. Мінск” раздзела 1 “Матэрыяльныя нерухомыя гісторыка-культурныя каштоўнасці” Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, зацверджанага пастановай Міністэрства культуры ад 3 студзеня 2023 г. № 1, пазіцыі:

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| “713Г000020 | Будынак Нацыянальнага драматычнага тэатра імя М.Горкага | пачатак XX стагоддзя, 1902–1906 гады, 1930-я гады, 1950–1970 гады | г. Мінск, вул. Валадарскага, 5 (два будынкі) | 3 | рашэнні Рады ад 07.08.2001 № 66, 23.06.2015 № 11-01-01/6 | пастановы Савета Міністраў ад 14.05.2007 № 578, 02.08.2016 № 607 |
| 713Г000195 | Будынак Беларускай дзяржаўнай філармоніі | 1955-1959 гады | г. Мінск, пр. Незалежнасці, 50 | 3 | рашэнне Рады ад 18.01.2002 № 70 | пастанова Савета Міністраў ад 14.05.2007 № 578” |

замяніць пазіцыямі:

Зак. 1335

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| “713Г000020 | Будынак Нацыянальнага драматычнага тэатра імя М.Горкага | пачатак XX стагоддзя, 1902–1906 гады, 1930-я гады, 1950–1970 гады | г. Мінск, вул. Валадарскага, 5 (два будынкі) | 2 | рашэнні Рады ад 07.08.2001 № 66, 23.06.2015 № 11-01-01/6, 10.02.2025 №04-01-02/1 | пастановы Савета Міністраў ад 14.05.2007 № 578, 02.08.2016 № 607; пастанова Міністэрства культуры ад 13.02.2025 № 9 |
| 713Г000195 | Будынак Беларускай дзяржаўнай філармоніі | 1955-1959 гады | г. Мінск, пр. Незалежнасці, 50 | 2 | рашэнні Рады ад 18.01.2002 № 70, 10.02.2025 №04-01-02/1 | пастанова Савета Міністраў ад 14.05.2007 № 578; пастанова Міністэрства культуры ад 13.02.2025 № 9”. |

3. Гэта пастанова ўступае ў сілу пасля яе падпісання.

Міністр Р.І.Чарнецкі